

**Павел Сапоцька (другі справа) сярод удзельнікаў форуму ў Інданезіі.**

# На карысць устойлівага міру

## БЕЛАРУСЬ І СВЕТ




**У сярэдзіне кастрычніка на востраве Балі ў Рэспубліцы Інданезія адбыўся Сусветны культурны форум – адна з самых аўтарытэтных падзей у свеце ў сферы культуры. У межах мерапрыемства ўпершыню прайшоў Міжнародны маладзёжны форум. Рэспубліку Беларусь у далёкай усходнеазіяцкай краіне прадстаўляў наш зямляк – адказны сакратар фонду «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага», дырэктар мастацкай галерэі «Універсітэт культуры», выкладчык Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Павел САПОЦЬКА. Сёння ён дзеліцца з чытачамі «МГ» сваімі ўражаннямі аб сустрэчах на карысць міру.**

Арганізатарам Сусветнага культурнага форуму (WCF) выступіла Міністэрства адукацыі і культуры Рэспублікі Інданезія пры падтрымцы ЮНЕСКА. Асноўная тэма WCF – «Культура на карысць інклюзіўнага і ўстойлівага міру». Даклады асноўных спікераў форуму – навукоўцаў, дыпламатаў, журналістаў, кіраўнікоў буйных устаноў культуры і адукацыі – былі прысвечаны пытанням гуманітарнага супрацоўніцтва, устойлівага развіцця, мультыкультуралізму і міжкультурных камунікацый, міжнародных канфліктаў... Як ніколі актуальная і важная роля ў паведамленнях дакладчыкаў адводзілася Дэкларацыі тысячагоддзя Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, Пакту Рэрыха, Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове і заахвочванні разнастайнасці форм культурнага самавыяўлення і іншым праграмным дакументам вядучых сусветных інтэграцыйных аб'яднанняў.

Генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун у сваім відэазвароце заклікаў усіх «берагчы культуру як самае каштоўнае, крохкае, цудоўнае і высакароднае». «Культура збліжае, разнастаіць наша жыццё, робіць выдатным кожнае імгненне і ратуе ад шэрасці і забыцця», – адзначыў Пан Гі Мун.

Уразіў маштаб падзеі: сотні вядучых тэлерадыёкампаній з розных краін свету, прамая трансляцыя на ўсіх тэлеканалах Інданезіі, дыпламатычны корпус, прадстаўнічыя міжнародныя дэлегацыі... Канферэнцыі, круглыя сталы, фестывалі, рэпетыцыі, рабочыя сустрэчы станавіліся арэаламі рэальнага міжкультурнага дыялогу. Карнавал у горадзе Дэнпасар, куды прыехалі танцавальныя калектывы з усяго свету, уразіў сваім высокім узроўнем і шчырай цікавасцю як гледачоў, так і ўдзельнікаў адзін да аднаго.

Адной з ключавых падзей WCF стаў Міжнародны маладзёжны форум на тэму «Культура моладзі для сацыяльнай трансфармацыі і роўнасці». Моладзь свету была прадстаўлена 150 удзельнікамі больш як з сарака краін свету. На працягу шасці дзён яны працавалі ў некалькіх секцыях. Кожная з іх у выніку падрыхтавала спектр прапаноў па пэўнай праблематыцы, пасля чаго на агульным пасяджэнні была адобрана рэзалюцыя форуму. Яна ўтрымлівае комплекс прапаноў, накіраваных на актывізацыю міжнароднага супрацоўніцтва моладзі ў гуманітарнай сферы, інстытуцыянальную падтрымку арганізацый самакіравання моладзі, інтэнсіфікацыю ўзаемадзеянняў маладзёжных асацыяцый з дзяржаўнымі органамі і інстытутамі грамадзянскай супольнасці, шырокае развіццё валанцёрскіх практык і многае іншае. Надзвычай насычаны графік, тым не менш, спрыяў наладжванню ўзаемаадносін з прадстаўнікамі замежных краін, дазволіў не толькі далучыцца да культурнай спадчыны Інданезіі і азнаёміцца з тэндэнцыямі развіцця культуры на сучасным этапе, але і максімальна прэзентаваць нашу краіну, унікальны гісторыка-культурны патэнцыял і магчымасці сённяшняга дня Беларусі. Намаганні не аказаліся дарэмнымі: прыемна было неўзабаве бачыць побач з сабой маладых людзей, якія падносілі тэлефон з фотаздымкамі на экране: Мірскі замак, Вялікі тэатр, Палац Незалежнасці, Нацыянальная бібліятэка, Храм Усіх Святых... І прасілі расказаць пра «такую прыгажосць». Многія дэлегаты атрымалі ў якасці невялікага сувеніра наборы паштовак аб горадзе Маладзечне. Генеральнаму дырэктару Дэпартамента культуры Міністэрства адукацыі і культуры Інданезіі Хілману Фарыду дасталася кніга аб нашым горадзе.

Цяпер, пасля спаду эмоцый і асэнсавання ўсяго ўбачанага і пачутага, з'яўляюцца канкрэтныя ідэі аб супрацоўніцтве. Шматлікія электронныя паведамленні, якія прыходзяць штодня на маю пошту, абмен думкамі і планамі сведчаць пра тое, што ў хуткім часе з'явіцца магчымасць рэалізаваць цікавыя праекты, нараджэнню якіх паспрыяла наведванне такой далёкай і цікавай краіны – Рэспублікі Інданезія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ